Прадстаўляць Хрыста і выконваць Яго заданне

Аўтар: Кінга Красіцкая
18.03.2018 00:00



У Вялікі чацвер Езус устанавіў сакрамант святарства. У гэты дзень шматлікія вернікі скіроўваюць свае думкі і пажаданні да ўсіх святароў, дзякуюць ім за прамоўленае Божае слова, за цэлебрацыю Эўхарыстыі, а таксама за ахвяру іх жыцця, складзеную на карысць Богу і людзям. ***Ролю святара нельга вымераць фінансавымі паказчыкамі, адміністрацыйнымі, будаўнічымі або навуковымі дасягненнямі, нават годнасцямі і функцыямі, якія ён выконвае ў Касцёле. Адпаведнай мерай святарства з'яўляецца само служэнне. Святар нясе паслугу людзям у Хрысце, праз Хрыста і з Хрыстом. Ён – служыцель збаўлення, шчасця і свабоды дзяцей Божых. Чаму быць святаром – не прафесія?***

Ёсць прафесіі – напрыклад, настаўнік, урач – выкананне абавязкаў якіх было б складаным без ласкі паклікання. Аднак атрымаўшы адпаведныя навыкі ў падобнай прафесіі, такая праца можа стаць магчымай і часта нават дастакова эфектыўнай, але акажацца менш плённай і не будзе прыносіць задавальнення. Са святарствам справа выглядае абсалютна інакш. Эфектыўнасць выканання святарскай паслугі залежыць не ад тэалагічнай, літургічнай, педагагічнай ці якойнебудзь іншай кваліфікацыі, а ад спецыяльнага Божага намашчэння – сакраманту, дзякуючы якому здзяйсненне літургічных чынаў дасягае свайго выніку – праяўлення дзейнасці Усемагутнага ў асобе ці супольнасці. Абавязковасць такога намашчэння Бог аб'яўляе яшчэ ў старазапаветныя часы, выбіраючы калена Левія для ролі святароў. † У часы Новага Запавету святар з'яўляецца відавочным знакам прысутнасці Хрыста сярод свайго люду. Таму быццё гэтым знакам не можа абмяжоўвацца ні часам, ні тэрыторыяй, ні агулам выконваемых абавязкаў, ні інтэлектуальнай кваліфікацыяй. У кожным часе і месцы, у кожнай супольнасці, у адносінах да кожнага чалавека, незалежна ад акалічнасцей, святар прадстаўляе Езуса, з'яўляецца праяўленнем Яго ахвярнай любові. Папа Францішак лічыць святарства хутчэй спецыфічным стылем жыцця намашчанага чалавека, чым прафесіяй, абцяжаранай пэўнымі абавязкамі. Менавіта гэтым асаблівым намашчэннем і спосабам жыцця святар адрозніваецца ад іншых людзей у свеце, якія працуюць як згодна з паклікaннем, так і з-за абавязку.

Прадстаўляць Хрыста і выконваць Яго заданне

Аўтар: Кінга Красіцкая
18.03.2018 00:00



